на-рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай Пётр Скарга. Навучанне ў акадэміі было бясплатным.

У XVI ст. тут вучыліся 700 студэнтаў і працавалі 54 выкладчыкі. У XVII ст. колькасць студэнтаў павялічылася да 1200 чалавек, а выкладчыкаў да 75.

Для спаборніцтва ў вучобе лепшым студэнтам прысвойвалі тытулы імператараў, цэсараў, прэфектаў. У якасці ўзнагарод уручаліся медалі, кнігі, выявы святых і інш. Для пакарання адстаючым студэнтам адзявалі аслінья шапкі са званочкамі, саджалі ў карцэр, падвяргалі цялесным карам: прафесар мог наказаць 3 –5 ударамі палкі, прэфект (прарэктар) ад 10 да 15. Але калі маладыя прафесары перавышалі сваю ўладу, іх саміх падвяргалі цялеснаи кары.

Пры універсітэце быў закладзены цудоўны батанічны сад, працавала багацейшая для таго часу бібліятэка. Пачаткам для стварэння бібліятэкі паслужыла кнігасховішча Сігізмунда - Аўгуста, якое заключала ў сабе ўсё, што ў яго час было надрукавана на ўсіх мовах. Акрамя таго, Сігізмунд перадаў бібліятэцы шмат рукапісаў. Другім вядомым мецэнатам бібліятэкі быў віленскі епіскап Пратасевіч. Іх прыкладу паследавалі іншыя. Леў Сапега падараваў 3000 кніг. Поўны збор кніг бібліятэкі складаў звыш 60 тыс.

У 1803 г. імператар Аляксандр I перайменаваў Віленскую акадэмію ў імператарскі універсітэт. Тут працавалі 4 факультэты: фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычны (з багаслоўем) і літаратурны.

У XIX ст. еўрапейская частка Расіі была падзелена на 6 навучальных акруг. Беларускія губерні ўвайшлі ў склад Віленскай. Вучэбным, адміністрацыйным і культурным цэнтрам акругі стаў Віленскі універсітэт. Яму былі падначалены ўсе навучальныя ўстановы: гімназіі, акружныя вучылішчы, павятовыя і прыхадскія школы, прыватныя вучылішчы і пансіёны.

У пачатку XIX ст. студэнты універсітэта прымалі актыўны ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху. Яны стваралі тайныя патрыятычныя таварыствы філаматаў і філарэтаў, падтрымлівалі паўстанне 1830–1831 гг.

У 1828 г. універсітэт святкаваў 250-гадовы юбілей, а ў 1832 г. за ўдзел студэнтаў у паўстанні быў закрыты. Пачалася ўзмоцненая русіфікацыя насельніцтва краю. Была ліквідавана Віленская навучальная акруга, закрыты 190 каталіцкіх манастыроў і ўсе школы, якія пры іх існавалі, значна скарацілася сетка навучальных устаноў. У Беларусі не засталося ні адной вышэйшай навучальнай установы.

У 1833 г. руская мова на тэрыторыі Беларусі была ўведзена ў якасці дзяржаўнай.

Грыцкевіч А.П.,
докт.гіст. навук,
прафесар

## ПАДРЫХТОЎКА ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ

Цяжкая для Беларуска - Літоўскай дзяржавы вайна, пагроза заваёвы тэрыторыі Беларусі войскамі цара Івана IV Жахлівага паставілі ў парадак дня пытанне аб больш цесным саюзе Вялікага княства Літоўскага з Польскім каралеўствам.

Сярод саслоўя феадалаў не было адзінства ў гэтым пытанні. Верхавіна саслоўя, магнаты, не згаджаліся на аб'яднанне з Польшчай, бо бачылі ў гэтым пагрозу незалежнасці дзяржавы, пагрозу сваім інтарэсам у кіраванні ёю, не хацелі дзяліць уладу з польскімі магнатамі. Яны разлічвалі, што здолеюць сваімі сіламі абараніць дзяржаву ад маскоўскай пагрозы.

Асноўная частка класа феадалаў — сярэдняя і дробная шляхта — не бачыла такога выхаду. Вайна для яе была вялікім цяжарам, і шляхта шукала саюзніка ў Польшчы. Беларуская шляхта была супраць далучэння яе тэрыторыі да Маскоўскага царства і ўсімі сіламі змагалася супраць маскоўскай агрэсіі. Перспектыву далучэння да Расіі яна не ўспрымала, таму што ў Беларуска - Літоўскай дзяржаве правы шляхты былі значна большымі, чым у дваран у Маскоўскай дзяржаве, у тым ліку маёмасныя. У Вялікім княстве Літоўскім шляхта карысталася асабістай недатыкальнасцю, чаго не было ў Маскоўскай дзяржаве. Праз некалькі год шляхта дамаглася мясцовага самакіравання (соймікі ў паветах і выбіраемыя суды) і яшчэ раней замацавала свае права выбіраць у сойм. Тут не было самадзяржаўнага рэжыму, як у Маскоўскай дзяржаве. Шляхта бараніла сваю зямлю, свой народ, зыходзячы са старадаўняй патрыятычнай пазіцыі.

Ужо 13 верасня 1562 г. пасля паходу і перад роспускам вайсковага апалчэння шляхта Беларусі ў ваенным лагеры ля Віцебска прыняла акт і накіравала яго ў Вільню да вялікага князя заключыць унію з Польшчай, каб мець агульныя соймы з польскай шляхтай, разам выбіраць караля і, галоўнае, карыстацца аднолькавымі правамі з польскай шляхтай (у якой было яшчэ больш правоў) і разам абараняцца ад ворагаў. Беларуская шляхта звярнулася з гэтым да жамойцкай шляхты, якой у вайсковым лагеры не было. Такім чынам, беларуская шляхта была ініцыятарам уніі. Беларускія і літоўскія магнаты на чале з Мікалаем Янавічам Радзівілам, віленскім ваяводай, канцлерам і маршалкам земскім, выступілі супраць уніі з Польшчай. Таму рашэнне пытання аб уніі зацягнулася на некалькі гадоў.

Віленскі сойм 1563 г. узнавіў разгляд гэтага пытання. Была вылучана дэлегацыя (разам з прадстаўнікамі магнатаў) на перагаворы з Польшчай аб уніі. Наказ сойма сваёй дэлегацыі быў у многіх пунктах падобны на акт Віцебскага палявога сойму



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1562 г. Але магнаты дамагліся, каб быў уключаны пункт аб пэласнасці Вялікага княства Літоўскага,яго самабытнасці і значнай часткі самастойнасці. Захоўваліся і асобныя соймы.

Польскія ж магнаты былі прыхільнікамі поўнага ўключэння (інкарпарацыі) Вялікага княства Літоўскага ў склад Польшчы. Іх праграму падтрымлівала польская шляхта.

Перагаворы аб уніі вяліся на Варшаўскім сойме 1563--1564 гг., але абодва бакі да поўнай дамоўленасці не прыйшлі. Кароль польскі і вялікі князь літоўскі і рускі Жыгімонт Аўгуст таксама дамагаўся рэальнай уніі абедзвюх дзяржаў, а не толькі персанальнай, як таго хацеў беларуска-літоўскі бок. Новыя перагаворы працягваліся на сойме Вялікага княства Літоўскага ў Бельску-Падляшскім у чэрвені 1564 г., а потым на польскім сойме ў Парчаве ў ліпені 1564 г. Беларуска-літоўскія магнаты згаджаліся толькі на персанальную унію (адзін кароль, ён жа вялікі князь) і на ваенна-палітычны саюз. Потым гэтае пытанне разглядалася на сойме ў Берасці ў 1566 г. і на польскім сойме ў Любліне. За гэты час шляхта Беларуска-Літоўскай дзяржавы дабілася значнага пашырэння сваіх правоў: быў прыняты другі Статут Вялікага княства Літоўскага ў 1566 г. Потым зноў пытанне аб уніі разглядалася на палявым сойме 1567 г. у Лебедзеве (г.зн. у вайсковым лагеры), а потым на Гродзенскім сойме 1568 г. Ваенныя абставіны падчас Лівонскай вайны прымусілі дэпутатаў ад паветовых соймікаў Вялікага княства Літоўскага сабрацца на агульны сойм у Любліне ў студзені 1569 г. Аднак па-ранейшаму існавалі розныя праекты аб'яднання абедзвюх дзяржаў з большай ці меншай ступенню федэратыўнага злучэння.

Бяспалая М.А.,
канд. гіст. навук,
дацэнт

## УПЛЫЎ САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫХ АБСТАВІН НА КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЕ ЖЫЦЦЁ ВЁСКІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 20-Х ГАДОЎ

За перыяд 1921--25 гг. беларуская вёска перажыла шмат пераўтварэнняў, вырашыла мноства задач як сацыяльна-эканамічнага, так і палітыка-асветніцкага плана. Стан апошніх у значнай ступені залежыў ад эканамічнага становішча вёскі. У сярэдзіне 20-х гадоў у вёсцы адбыліся некаторыя станоўчыя змены. Менавіта перш за ўсё трэба адзначыць актыўнае развіццё разнастайных відаў кааперацыі. Справа гэта для беларускага сялянства была не новая, кааператыўны рух існаваў яшчэ да першай сусветнай вайны. Але ў другой палове 20-х гадоў ён зноў актывізаваўся пасля таго, як адбылося больш-менш уяўнае аднаўленне гаспадаркі. Адначасова працягвалі паглыбляць асветніцкую працу сярод аднавяскоўцаў і сяляне-культурнікі.

Некаторыя захады ў бок паляпшэння стану асветніцкіх устаноў і іх працы на вёсцы рабілі і кіруючыя органы, праўда, на жаль, больш дырэктывамі, чым адчувальнай матэрыяльнай ці метадычнай дапамогай. І ў другой палове 20-х гадоў большасць культурна-асветніцкіх устаноў хварэла ўжо вядомай хваробай: з 307 хат-чытальняў у 1928 г. толькі 45 працэнтаў мелі свае памяшканні, але і многія з іх былі недастаткова прыстасаваны. Як і раней, у сваёй большасці хатнікі былі не падрыхтаваны да работы, а ішлі на гэтыя пасады таму, што больш не было куды ісці. Кіраўніцтва спрабавала выправіць становішча, ствараючы курсы перападрыхтоўкі хатнікаў, якія за 1926--28 гг. выпусцілі 360 чалавек, але ўсе яны былі накіраваны на іншую работу.

У азначаны перыяд з гэтых прычын культурна-і палітыка-асветніцкая праца не магла быць вельмі эфектыўнай, але, з другога боку, яна была разнастайнай. Найбольш папулярнымі былі сельскагаспадарчыя гурткі, на іх пасяджэннях вывучаліся пытанні культурнага земляробства, садаводства, жывёлагадоўлі. Праграма прадугледжвала тэарэтычныя і практычныя заняткі, якія праводзілі спецыялісты.

Адносна актыўна вялася прапаганда кааператыўнага руху, але спецыяльных методык гэтай прапаганды не было.

Масавая работа сельскіх асветніцкіх устаноў, як і раней, заключалася ў правядзенні сялянскіх сходаў, арганізацыі вечарын і чыткі газет уголас, выдачы сялянам даведак, напісанні заяў, зборы грошай для розных таварыстваў.

Вынікі культурна-асветніцкай работы былі падведзены і абмеркаваны на з'ездзе хатнікаў у сакавіку 1927 г. На ім прысутнічала 280 дэлегатаў, з іх 106 работнікаў палітпрасветустаноў. Сярод іншых абмяркоўвалася пытанне аб становішчы і задачах паліт-асветустаноў у вёсцы.

Разгарнулася гарачая дыскусія, якая паказала асноўную супярэчнасць: з аднаго боку, усе згодны з мэтамі і задачамі палітасветустаноў як асноўных праваднікоў партыйнага ўздзеяння на сялянства, а з другога -- усе сцвярджалі, што пры існуючым матэрыяльным і кадравым стане, пры бюракратычным кіраўніцтве з боку цэнтральных органаў выканаць задачы вельмі складана.

Тым не менш на канец 1928 г. праявілася некаторая стабілізацыя сістэмы культасветустаноў, паступова пачало паляпшацца іх матэрыяльнае становішча, прымаліся меры па рашэнню кадравых праблем. У асноўным ужо былі выпрацаваны формы і метады асветніцкай працы ў вёсцы. Магчыма, хата-чытальня паступова стала б цэнтрам культурнага жыцця вёскі, калі б не былі прыняты рашучыя меры па калектывізацыі. Яны прывялі да нечаканых і негатыўных змен у становішчы вёскі і стане культурна-асветніцкай работы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ